Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

10 ЖНІЎНЯ 2012 г. ПЯТНІЦА № 153 (27268) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«У БЕЛАРУСІ ДАСТАТКОВА СРОДКАЎ ДЛЯ ВЫПЛАТЫ ЗНЕШНІХ ПАЗЫК І ПАВЫШЭННЯ ЗАРАБОТНАЙ ПЛАТЫ»

Фота БЕЛТА.

Цырымонія закладкі капсулы з пасланнем будучым пакаленням адбылася на пляцоўцы будаўніцтва беларускай АЭС пры ўдзеле Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі.

Ва ўрачыстай абстаноўцы Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заклаў капсулу ў памятны камень, устаноўлены на пляцоўцы будаўніцтва беларускай АЭС. Затым кіраўнік дзяржавы разам з першым віцэ-прэм'ерам Уладзімірам Сямашкам, губернатарам Гродзенскай вобласці Сямёнам Шапірам і першым намеснікам генеральнага дырэктара Дзяржкарпарацыі па атамнай энергіі «Расатам» Аляксандрам Лакшыным замацаваў на камні памятную таблічку.

«Стварэнне нацыянальнай ядзернай энергетыкі — значны крок ва ўмацаванні энергетычнай бяспекі краіны, моцны стымул паскарэння навукова-тэхнічнага прагрэсу і інавацыйнага развіцця», — гаворыцца ў падпісаным Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам пасланні. У ім выказваецца ўпэўненасць у тым, што прынятае стратэгічнае рашэнне аб будаўніцтве ў Беларусі атамнай электрастанцыі дасць магчымасць забяспечыць далейшы дынамічны ўздым эканомікі, павысіць дабрабыт людзей і змяніць жыццё перспектыўнага рэгіёна. «Увасабляючы ў жыццё дэвіз аб пабудове моцнай і працвітаючай Беларусі — дзяржавы для народа, мы пачынаем рэалізацыю буйнога сумеснага з брацкай Расіяй інвестыцыйнага праекта — будаўніцтва першай атамнай электрастанцыі на нашай тэрыторыі», — адзначана ў пасланні.

У пасланні нашчадкам выказваецца надзея на тое, што будучыя пакаленні з удзячнасцю ацэняць уклад у стварэнне надзейнай энергетычнай базы як асновы для ўстойлівага развіцця краіны і павышэння яе ролі ў сусветнай супольнасці.

У Беларусі дастаткова сродкаў для выплаты знешніх пазык і павышэння заработнай платы, заявіў журналістам Аляксандр Лукашэнка ў час рабочай паездкі ў Гродзенскую вобласць.

«Для таго каб пару мільярдаў гэтых даўгоў выплаціць — праблем ніякіх няма. Гэтыя грошы ўжо ёсць сёння без выкарыстання золатавалютных рэзерваў», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Нацыянальнаму банку Беларусі даведзена заданне па нарошчванні аб'ёму ЗВР, і ён спраўляецца з апярэджаннем. А ўраду, паводле слоў Прэзідэнта, дадзена заданне зарабіць грошы на развіццё краіны, на павышэнне зарплаты людзям і на вяртанне знешніх пазык.

Паводле звестак за першае паўгоддзе, эканоміка Беларусі развіваецца стабільнымі тэмпамі. ВУП краіны за 6 месяцаў вырас амаль на 3 працэнты, а знешнегандлёвае сальда практычна дасягнула $2 млрд, стаўшы рэкордным за апошнія 10 гадоў. Разам з тым, на наступныя два гады выпадае асноўная нагрузка па выплаце знешніх пазык. У сувязі з гэтым у некаторых узнікаюць апасенні, ці зможа Беларусь, выконваючы даўгавыя абавязацельствы, захаваць тэмпы эканамічнага росту і давесці памер заработнай платы да $500.

Прэзідэнт, адказваючы на пытанні журналістаў, даў тлумачэнне наконт такіх апасенняў: «Абсалютна дакладна заяўляю: калі не хопіць (фінансавых рэсурсаў у дзяржавы. — *Заўвага БЕЛТА*), і зарплату павышаць не будзем. Але тое, што павінны вярнуць па даўгах, вернем». «Калі б не было гэтых даўгоў, вядома ж, эканоміка развівалася б больш высокімі тэмпамі. Яны і так прымальныя, але былі б больш высокімі», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы яшчэ раз нагадаў, што для павышэння заработнай платы неабходна перш за ўсё павысіць прадукцыйнасць працы, а пасля гэтага зароблены грошы аддаць людзям у выглядзе павышанага памеру заработнай платы. «Я бачу, што гэта зрабіць можна. І патрабаванні невялікія — што такое 500 долараў? Гэта не грошы. Таму страху ў гэтым няма», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ў тым выпадку, калі б не хапала грошай для забеспячэння і абслугоўвання знешніх пазык, то не магло б ісці і гаворкі аб павышэнні заработнай платы, кіраўнік дзяржавы растлумачыў, чаму. «Таму што калі мы хоць на адну прыступку самі свой рэйтынг панізім (затрымаўшы выплаты па знешніх даўгах. — *Заўвага БЕЛТА*), нам ніхто ніколі не пазычыць грошы і крэдытаў не дадуць», — растлумачыў Аляксандр Лукашэнка.

«Калі ўжо мы будзем бачыць, што не паспеем расіянам вярнуць мільярд долараў, я ўжо як-небудзь дагаварыся з Прэзідэнтам Расіі, каб ён адтэрмінаваў на год гэта вяртанне», — сказаў Прэзідэнт Беларусі. На яго думку, Беларусь таксама ў выпадку неабходнасці магла б дамовіцца аб адтэрміноўцы плацяжоў з такімі краінамі, як Кітай і Іран, у якіх наша краіна брала крэдыт.

Разам з тым, пакуль Беларусь спраўляецца з выплатай абавязацельстваў па знешніх пазыках. Больш таго, магчыма датэрміновае вяртанне некаторых з іх. «У бліжэйшы час будзем весці перагаворы з адным з банкаў, каб датэрмінова аддаць грошы», — праінфармаваў Прэзідэнт Беларусі.

СТАР 2

УРАДАВАЯ ТЭЛЕГРАМА

Прыміце самыя шчырыя віншаванні з нагоды 95-годдзя з дня выхаду ў свет першага нумара газеты «Звязда». За гады свайго існавання газета стала ўплывовым грамадска-палітычным выданнем, якое аб'ектыўна і ўсебакова асвятляе жыццё краіны і грамадства, у тым ліку ў сферы сацыяльна-працоўных адносін. Спадзяюся на далейшае плённае супрацоўніцтва па інфармацыйным забеспячэнні дзейнасці Міністэрства працы і сацыяльнай абароны і жадаю Вам і ўсяму калектыву «Звязды» здароўя, творчых поспехаў, вялікіх тыражоў і ўдзячных чытачоў.

Міністр працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь ШЧОТКІНА М.А.

БРАТЫ-2

Спецыяльны карэспандэнт «Звязды» перадае з Лондана

Фота Сяргея НЕВЯРКЕВІЧА.

Учарашні дзень на алімпійскіх гульнях у Лондане быў звязаны з надзеямі на медаль у мястэчку Ітон Доуні, што ў прыгарадзе Лондана. Тут спробу ўзняцца на п'едэстал рабілі алімпійскія чэмпіёны Пекіна на дыстанцыі 1000 метраў браты Аляксандр і Андрэй Багдановічы. На радасць усім прысутным беларускім журналістам, вада для нашага дуэта аказалася «лёгкай», хоць і халаднейшай, чым у Пекіне, і на фінішы хлопцы аказаліся другімі. Паколькі заезд з удзелам беларусаў у спісе усіх фіналаў стаяў напарадзе, то ўся працэдура ўзнагароджвання і фотасесіі завяршылася даволі хутка, пасля чаго сярэбраныя прызёры трапілі ў цесныя журналісцкія абдымкі. Да зорных братоў пытанняў — хоць адбаўляй.

— Як ацэніце ход гонкі? Было відаць, што на старце вы «засядзеліся». А потым давялося наганяць страчаныя секунды.

Андрэй: Ваш погляд збоку, таму вам так здалося. На самой справе мы раўнамерна ішлі па дыстанцыі, стараліся раскласці яе па частках, каб не было ніякіх западзенняў ці правалаў. Мы выступілі настолькі, наколькі былі гатовы. У паўфінале трымалі тэмп на 60 грабкоў у хвіліну, а тут трэнер гаворыць: у фінале пераходзім на 57.

Аляксандр: Карэкціроўка тэмпу робіцца трэнерам з улікам нашай гатоўнасці да гонкі. Каб раўнамерна прайсці ад старту да фінішу. Таму і пэўны час трымаліся ў цені. Напрыканцы прыбаўлялі як маглі. Аднак, як паказала гонка, — вышэй галавы нам скокнуць было цяжка. Золата засталося за немцамі.

— За сапернікамі ўдалося глядзець, каб кантраляваць сітуацыю?

Андрэй: Я нікога не бачыў, бо мог глядзець толькі направа, а там была пустая вада — сапернікі на крайняй дарожцы адсталі.

Аляксандр: Калі знаходзішся ў лодцы, а перад табой стаіць задача выступіць у поўную сілу і дабіцца годнага выніку, то глядзець у бок сапернікаў не прыходзіцца. Цалкам аддаешся гонцы.

— Каго з фіналістаў болей за ўсіх асцерагаліся?

Андрэй: Мы былі ўпэўнены, што адным з прэтэндэнтаў на золата стане нямецкі экіпаж. Хоць непрыемнасцяў можна было чакаць і ад іншых — азербайджанцаў, румынаў, расіян.

Аляксандр: Лічыце, усе дастойныя сапернікі былі. Таму давялося выкладвацца па максімуме. Хочацца яшчэ раз паўтарыцца: мы зрабілі на дыстанцыі ўсё, што змаглі. Але ж нам не хапіла лёгкасці, камфорту на дыстанцыі. Магчыма, залішне хваляваліся. Думаю, што немцы таксама не адразу выйшлі ў лідары. Мне здаецца, што яны былі больш лёгкімі на вадзе.

— Вяслярны канал аказаўся прывычным, ці нешта ў ім асаблівае ёсць?

Андрэй: Ён нагадвае наш брэсцкі канал, вельмі зручны, на ім прыемна было працаваць.

Аляксандр: Нам вельмі пашанцавала з надвор'ем. Ні ветру, ні дажджу. Мы колькі часу тут былі, то ўвесь час дзьмуў вецер. Часам ён не даваў нам трэніравацца. Таму выбіралі дарожкі на фінал, каб вецер быў не такі адчувальны. З-за гэтага ў паўфінале давялося ўступіць першую пазіцыю расійскаму эпіпажу. Але ж сёння было надзвычай ціха. Такі штыль дазволіў паказаць мацнейшага, бо ўсе былі ў аднолькавых умовах.

— Прызнайцеся, сярэбраныя медалі лонданскага ўзору больш прымушаюць радавацца ці нагадваюць пра нерэалізаваныя магчымасці?

Андрэй: Алімпійская ўзнагарода любой вартасці — гэта вялікае дасягненне. А з улікам таго, што канкурэнцыя на дыстанцыі надзвычай высокая, то, безумоўна, серабро — гэта радасць. На гэты дзень мы былі гатовы, каб стаць сярэбранымі прызёрамі.

Аляксандр: Мы паказалі вельмі добры вынік. Але ж хто не марыць стаць двухразовым алімпійскім чэмпіёнам? Таму невялікі асадак ад таго, што не змаглі дабрацца да золата, застаўся. Прынамсі, як той казаў, марыць не шкодна, трэба рэальна ацэньваць свае магчымасці. На фінішы нам не хапіла хуткаснай вынослівасці і сіл, каб наш спурт аказаўся больш імклівым.

СТАР 2

Калектыву ўстановы «Рэдакцыя газеты «Звязда»

Паважаныя сябры!

Прыміце шчырыя віншаванні з нагоды 95-годдзя з дня заснавання газеты «Звязда».

Гісторыя газеты непарыўна звязана з гераічным мінулым нашай краіны. Яе старонкі — дакладны і праўдзівы летапіс беларускага народа.

У пройдзеным «Звяздой» плённым шляху ўвасоблены галоўныя падзеі станаўлення і развіцця нашай дзяржавы, лёсы людзей і захаваны лепшыя традыцыі выдання. У газеце ў розныя гады працавалі і друкаваліся вядомыя дзяржаўныя і грамадскія дзеячы, народныя паэты і пісьменнікі Беларусі. Гэта і першыя рэдактары газеты — Аляксандр Мяснікоў, Міхаіл Фрунзе, Вільгельм Кнорын, Уладзімір Амельянюк, а таксама Янка Купала і Якуб Колас, Пятрусь Броўка, Максім Танк, Іван Шамякін, Янка Брыль, Васіль Быкаў і іншыя, праўдзівае слова якіх гучала набатам у часы ліхалецця і аб'ядноўвала народ у імя Перамогі і працоўных здзяйсненняў.

Сёння газета «Звязда», заснавальнікам якой з'яўляецца Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, — шматграннае выданне са сваім адметным, непаўторным стылем, якое ўдала спалучае традыцыі і сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі, што адпавядае часу і патрабаванням чытачоў. Вашай газеце належыць значная роля ў асвятленні пытанняў сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця краіны, фарміраванні высокіх традыцый нацыянальнай журналістыкі, выхаванні цэлай плеяды выдатных прафесіяналаў.

Упэўнены, што «Звязда» і надалей будзе заставацца авангардам беларускага друкаванага слова.

Жадаю калектыву газеты «Звязда» шчасця, здароўя, дабрабыту, аптымізму, вострага пяра і творчага плёну на карысць роднай Бацькаўшчыны.

Прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь М. МЯСНІКОВІЧ.

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 18°
Віцебск	+ 18°
Гомель	+ 20°
Гродна	+ 17°
Магілёў	+ 18°
Мінск	+ 18°

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 10.08.2012 г.

Долар ЗША	8340,00	▼
Еўра	10310,00	▼
Рас. руб.	265,00	▲
Укр. грыўня	1030,77	▼

У БЕЛАРУСІ САБРАНА 7 млн тон ЗБОЖЖА

Паводле аператыўнай інфармацыі на 9 жніўня валавы збор збожжа ў сельскагаспадарчых арганізацыях рэспублікі склаў больш як 7 млн т, паведамілі БЕЛТА ў Міністэрстве сельскай гаспадаркі і харчавання. У мінулым годзе на гэту дату было сабрана 5,7 млн т збожжавых.

Сярэдняя ўраджайнасць збожжавых і зернебабовых культур на гэты час складае 38,2 ц/га, што на 3,5 ц/га вышэй за мінулагодні паказчык. Найвышэйшую ўраджайнасць па-ранейшаму маюць сельгасарганізацыі Гродзенскай вобласці, дзе з аднаго гектара атрымліваюць па 48,7 ц.

Намалот у Мінскай вобласці складае звыш 1,7 млн т, Гродзенскай — 1,35 млн т, Брэсцкай — каля 1,3 млн т, Магілёўскай — 974 тыс. т, Гомельскай — 936 тыс.т, Віцебскай — 788 тыс.т. У лік дзяржзаказу на 9 жніўня прададзена 816 тыс.т харчовага збожжа (69 працэнтаў да плана), гэта на 197 тыс.т больш, чым у мінулым годзе. У цэлым па рэспубліцы збожжавыя і зернебабовыя культуры ўбраны на плошчы больш за 1,8 млн га, што складае 76,3 працэнта да плана ўборкі.

ISSN 1990 - 763X

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Ганаровую грамату ад міністра інфармацыі Беларусі Алега ПРАЛЯСКОЎСКАГА атрымаў рэдактар аддзела эканомікі Леанід ЛАХМАНЕНКА.

«ЗВЯЗДА». ЧЫТАЙ ТУТ!

Учора наша газета адсвяткавала свой 95-гадовы юбілей. Яна ўжо больш як пяць разоў паўналетняя, сур'ёзная, аднак усё роўна маладая і часам легкадумная. Гэта адзначалі і сябры газеты, якія прыйшлі яе павіншаваць.

Галоўны рэдактар Алесь Карлюкевіч нагадаў на сустрэчы, што незадоўга да святкавання 95-годдзя адбылася навукова-практычная канферэнцыя ў Нацыянальнай акадэміі навук, прысвечаная гісторыі нашага выдання, бліскучы («Як я мяркую па ўражаннях балельшчыкаў і супрацоўнікаў») футбольны турнір, які праводзіўся на праспекце газеты «Звязда», і шмат іншых імпрэз у гонар самай старой беларускай газеты.

Госці паміж зычаннямі вялікіх будучых поспехаў увесь час успаміналі аб значнай гісторыі газеты і яе цяперашнім жыцці. Міністр інфармацыі Беларусі Алег Праляскоўскі заявіў, што газету ведаюць і любяць: «Яна карыстаецца аўтарытэтам у грамадстве. Гэта газета для людзей. Такой яна і павінна заставацца». Старшыня пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Аляксандр Юшкевіч сказаў: «Вы робіце вялікую добрую справу, за якую мы кажам вам вялікі дзякуй» і пажадаў газеце поспехаў і надалей.

Павел Якубовіч, галоўны рэдактар газеты «СБ. Беларусь сегодня», перарваў афіцыйнасць сустрэчы, шчыра расказаўшы, за што паважае «Звязду», і нават прызнаўся ёй у патаемнай любові: «Пра «Звязду» нельга гаварыць абыякава. На працягу апошніх 30 гадоў усе тыя, хто хацелі быць сур'ёзнымі журналістамі і працаваць у цікавай газеце, марылі працаваць ў «Звяздзе». Нават тыя, хто працаваў у іншых рэспубліканскіх выданнях. І справа была не ў заробках, уплывовасці. Вельмі высокім быў менавіта прэстыж журналіста, які працуе ў «Звяздзе». Я ведаю, што ў «Чырвонай змене» ўсе марылі, што, калі яны трошкі «падрастуць», іх возьмуць у «Звязду». І гэта былі не проста легкадумныя адчуванні. Насамрэч «Звязда» была заўсёды своеасаблівай газетай, аднак у той жа час — сур'ёзнай і паважанай. Праца ў «Звяздзе» была самай высокай ацэнкай журналісцкай творчасці. І я прызнаюся ў патаемнай любові да гэтай газеты. Мне вельмі хацелася, у пэўныя гады, надрукавацца ў ёй...» — засмяяўся Павел Ізотавіч. На гэтым прызнанні не скончыліся. Анатоль Лемяшонак, галоўны рэдактар газеты «Рэспубліка», старшыня Беларускага саюза журналістаў таксама «адкрыўся»: «Мы вам па-добраму зайздросцім. Вы трошкі не такія, як мы ўсе, бо вы несяце да людзей родную мову. У нас таксама ёсць такая магчымасць, але так, як у вас, не атрымліваецца». Уладзімір Андрыевіч, галоўны рэдактар «Народнай газеты», нагадаў аб выключнай блізкасці газеты да людзей і прафесіяналізме супрацоўнікаў: «На мой погляд, «Звязду» заўсёды вылучала інтэлігентнасць. Яе калектыў — узор адносін журналіста да сваёй справы, да сваёй Бацькаўшчыны.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Старшыня Беларускага саюза журналістаў, галоўны рэдактар газеты «Рэспубліка» Анатоль ЛЕМЯШОНАК уручае звяздоўцу Івана БАРАНОЎСКАГА з прысваенне звання Заслужанага журналіста.

І хоць зараз ёсць шмат новых патрабаванняў да журналістыкі ў сувязі з новымі магчымасцямі, зычу вам захаваць вашу інтэлігентнасць, людскасць, якая ў вас заўсёды была». А дзед кіраўніка Беларускага тэлеграфнага агенцтва Дзмітрыя Жука, як аказалася, вельмі доўгі час быў чытачом «Звязды»: «Газета цікавая. Яна адрозніваецца ад іншых. Я хачу сказаць вось што: мы выхоўваліся на гэтай газеце. Мой дзед чытаў яе больш за 60 гадоў. І тое, што было ў ёй напісана, для дзеда было наймацнейшым аргументам. У спрэчных сітуацыях ён заўсёды браў газету і казаў мне: «Чытай тут!».

Газета пачула віншаванні таксама ад Кацярыны Дубінскай, дырэктара інфармацыйнага агенцтва «Мінск-навіны», якая сказала, што яе работнікі вучацца ў «Звязды» глыбіні, і кіраўніка Адміністрацыі Савецкага раёна Мінска Генадзя Пасевіна.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

ПАХАЛАДАЛА

На наступным тыдні магчыма не больш як 13—20 цяпла

У пятніцу надвор'е на тэрыторыі Беларусі будзе фарміраваць зона панізжанага ціску і франтальны раздзел, які рухаецца да нас з боку Скандынаўскага паўвострава, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.

Таму ў большасці раёнаў сёння чакаюцца кароткачасовыя дажджы, а ўдзень у асобных раёнах Віцебскай вобласці моцныя ліўні, месцамі навальніцы. Максімальная тэмпература паветра — ад 16 цяпла на поўначы да 23 градусаў на поўдні Беларусі.

Халодна будзе і ў выхадныя. У суботу амаль паўсюдна, а ў нядзелю месцамі прагназуюцца кароткачасовыя дажджы, месцамі навальніцы. Тэмпература ўначы ўсяго 6—13, удзень — ад 15 цяпла на поўначы да 23 градусаў па поўні Беларусі.

У пачатку наступнага тыдня тэмпературны фон амаль не зменіцца. Дажджы ў панядзелак чакаюцца пераважна па паўднёва-ўсходняй палове краіны (там іх не было ўжо даўно), а ў аўторак і сераду ападкі будуць ужо на ўсёй тэрыторыі Беларусі. У ноч на панядзелак 7—14, а ўдзень 15—22 градусы.

У аўторак і сераду стане яшчэ халадней, калі максімальная тэмпература паветра ўдзень будзе не больш чым 13—20 градусаў. Сіноптыкі падлічылі, што ў гэтыя дні тэмпературны фон у Беларусі стане на 1—2 градусы ніжэй за кліматычную норму.

Сяргей КУРКАЧ.

У БЕЛАРУСІ З 14 ГАДОЎ УВОДЗІЦЦА АБАВЯЗКОВАЕ ДАКУМЕНТАВАННЕ ЗАМЕЖНАГА ГРАМАДЗЯНІНА АБО АСОБЫ БЕЗ ГРАМАДЗЯНСТВА

Аб гэтым паведамілі БЕЛТА ў Дэпартаменце па грамадзянстве і міграцыі МУС Беларусі.

З учарашняга дня ўступаюць у сілу змяненні і дапаўненні, унесеныя ўказам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 19.04.2012 № 197 у пералік адміністрацыйных працэдур, згодна з якім замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, якія дасягнулі 14-гадовага ўзросту, павінны атрымаць або пасведчанне на права жыхарства (для іншаземцаў, якія пастаянна пражываюць у Беларусі), або пасведчанне бежанца (для асоб, якім прадастаўлены статус бежанца ў Беларусі).

Акрамя таго, з гэтага часу да дасягнення 14 гадоў замежны грамадзянін або асоба без грамадзянства вызваляюцца ад выплаты дзяржаўнай пошліны за выдачу аднаразовых і шматразовых віз для выезду і ўезду ў Беларусь. Зніжаны і памер дзяржпошліны за выдачу візы: для выезду з Беларусі ён зніжаны з 2 да 1 базавай велічыні (цяпер базавая велічыня складае Br100 тыс.), для ўезду ў Беларусь і выезду з краіны — 2 базавыя велічыні (раней было 3).

У дадатак да гэтага цяпер іншаземцы могуць бясплатна атрымаць даведку аб прыёме дакументаў для атрымання дазволу на пастаяннае пражыванне ў Беларусі.

Таксама ўнесеныя папраўкі пашыраюць пералік суб'ектаў (замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, якія часова знаходзяцца і часова пражываюць у Беларусі), што ажыццяўляюць разавую рэалізацыю тавараў на рынках, кірмашах і месцах ажыццяўлення выязнога гандлю на тэрыторыі Беларусі і абавязаны ў сувязі з гэтым атрымліваць спецыяльныя дазволы на права вядзення такой дзейнасці. Адначасова павялічаны з 1 да 3 дзён тэрмін ажыццяўлення гэтай адміністрацыйнай працэдуры.

ЗМЕНЕНА ДЗЯРЖПОШЛІНА ЗА АТРЫМАННЕ І ЗАМЕНУ ВАДЗІЦЕЛЬСКІХ ПРАВОЎ

Дзяржпошліна за атрыманне і замену вадзіцельскіх правоў у Беларусі з учарашняга дня складае Br200 тыс., паведамілі БЕЛТА ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў Міністэрства ўнутраных спраў.

У МУС растлумачылі, што ў Беларусі кошт паслуг, якія аказваюцца дзяржаўнымі органамі, у тым ліку і падраздзяленнямі ДАІ (выдача вадзіцельскіх пасведчанняў, нумарных знакаў і інш.), у асноўным залежыць ад базавай велічыні. Памеры дзяржпошлін рэгулююцца двума дакументамі: Падатковым кодэксам і ўказам № 200 «Аб адміністрацыйных працэдурах, што ажыццяўляюцца дзяржаўнымі органамі і іншымі арганізацыямі па заявах грамадзян».

«Уступіўшым у сілу з 1 студзеня 2012 года новым Падатковым кодэксам быў прадугледжаны памер дзяржпошліны за атрыманне (замену) вадзіцельскага пасведчання ў памеры 4 базавых велічынь. Гэтыя змяненні прапрацоўваліся і былі ўнесены яшчэ ў мінулым годзе, да рашэння аб павышэнні памеру базавай велічыні», — растлумачылі ў МУС. Паколькі з 1 красавіка памер базавай велічыні быў установлены Br100 тыс., гэта прывяло б да аплаты грамадзянамі дзяржпошліны за вадзіцельскае пасведчанне ў памеры Br400 тыс.

«З улікам таго МУС выйшла з ініцыятывай у Савет Міністраў аб зніжэнні памеру дзяржпошліны на атрыманне (замену) вадзіцельскага пасведчання», — расказалі ў міністэрстве. Прапанова МУС была рэалізавана ва ўказе № 197 «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў ва Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 26 красавіка 2010 г. № 200». Гэты ўказ быў афіцыйна апублікаваны 8 мая ў Нацыянальным рэестры прававых актаў Рэспублікі Беларусь. Праз 3 месяцы пасля свайго афіцыйнага апублікавання (гэта значыць 9 жніўня) ён уступіў у сілу.

ПАВЫШАЮЦЦА АДПУСКНЫЯ ЦЭНЫ НА НІЗКАТЛУСТЫЯ МАЛОЧНЫЯ ПРАДУКТЫ

Гранічныя максімальныя адпускныя цэны на нізкатлустыя віды малочных прадуктаў у Беларусі павышаюцца ў жніўні на 35 працэнтаў, а ў верасні на 4 працэнты. Гэта прадугледжана пастановай Міністэрства эканомікі Беларусі ад 31 ліпеня 2012 года № 68, паведамілі БЕЛТА ў аддзеле сувязяў з грамадскасцю Мінэканомікі.

Каментуючы гэту пастанову, у міністэрстве адзначылі, што вытворчасць малака невысокай тлустасці і малочных прадуктаў без дабавак апошнім часам практычна спынілася ў сувязі з іх стратнасцю. І гэтыя прадукты, якія прынята называць «сацыяльным малаком», практычна адсутнічаюць на прылаўках магазінаў. Для павышэння зацікаўленасці вытворцаў у павелічэнні выпуску такіх прадуктаў пастановай № 68 павышаюцца гранічныя максімальныя адпускныя цэны на іх. Гэта датычыцца малака і кефіру тлустасцю да 3,5 працэнта, смятаны тлустасцю да 25 працэнтаў, тварагу тлустасцю да 9 працэнтаў без смакавых дабавак і напаўняльнікаў.

Так, напрыклад, гранічная максімальная адпускная цана на літр малака тлустасцю 1,5 працэнта ў поліэтыленавым пакеце ў жніўні будзе павышана з Br1415 да Br1910. Гэта значыць, што вытворцы змогуць падняць адпускную цану на свой тавар да гэтай мяжы пры продажы гандлёвым арганізацыям. У магазінах паўтарапрацэнтнае малако без дабавак будзе адпаведна даражэйшае, да яго вартасці будзе дабаўлена гандлёвая надбаўка (да 11 працэнтаў), ПДВ (10 працэнтаў), а таксама кошт упакоўкі, калі гэта не поліэтыленавы пакет.

Акрамя таго, гэтай пастановай Мінэканомікі прадугледжана магчымасць павышэння на 4 працэнты ў месяц арганізацыямі-вытворцамі ў жніўні і верасні 2012 года адпускных цэн на высакатлустыя віды малака, кефіру, смятаны, тварагу, а таксама на названыя малочныя прадукты са смакавымі дабаўкамі і напаўняльнікамі.

У міністэрстве нагадалі, што да гэтага часу дзейнічала норма пастановы № 35 аб неперавышэнні малакаперапрацоўчымі арганізацыямі ўзроўню адпускных цэн на высакатлустыя віды малака, кефіру, смятаны, тварагу, а таксама на названыя малочныя прадукты са смакавымі дабаўкамі і напаўняльнікамі. Гэты ўзровень цэн быў устаноўлены для іх 29 красавіка 2012 года. Новай пастановай ім дадзена такая магчымасць — павысіць цэны, каб кампенсаваць павелічэнне кошту малочнай сыравіны.

Пастанова Мінэканомікі № 68 уступае ў сілу пасля яе афіцыйнага апублікавання — з 11 жніўня 2012 года (афіцыйнае апублікаванне на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале Беларусі — 10 жніўня 2012 года).

ПАВЫШАЮЦЦА ЦЭНЫ НА ХЛЕБ, БАТОНЫ І МЯСА КУРАНЯТ

У Беларусі цэны на хлеб, батоны і мяса куранят павысяцца ў жніўні на 10 працэнтаў. Аб гэтым паведамілі БЕЛТА ў аддзеле сувязяў з грамадскасцю Міністэрства эканомікі.

З улікам росту закупачных цэн на збожжа ў жніўні на 10 працэнтаў павышаюцца гранічныя максімальныя адпускныя цэны на традыцыйныя віды без дабавак хлеба і батонаў, а таксама на мяса куранят-бройлераў», — адзначылі ў міністэрстве. Гэта прадугледжана пастановай Мінэканомікі ад 31 ліпеня 2012 года № 68. Яна ўносіць дапаўненні і змяненні ў пастанову Міністэрства эканомікі ад 26 красавіка 2012 года № 35 аб цэнах на сацыяльна значныя тавары.

Дакумент уступае ў сілу пасля яго афіцыйнага апублікавання — з 11 жніўня, афіцыйнае апублікаванне на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале Беларусі — 10 жніўня, удакладнілі ў Мінэканомікі.

«У БЕЛАРУСІ ДАСТАТКОВА СРОДКАЎ ДЛЯ ВЫПЛАТЫ ЗНЕШНІХ ПАЗЫК І ПАВЫШЭННЯ ЗАРАБОТНАЙ ПЛАТЫ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Дыпламатычны канфлікт са Швецыяй і інцыдэнт з палётам над Беларуссю шведскага самалёта не звязаны, заявіў Аляксандр Лукашэнка журналістам.

«Некаторыя звязваюць гэту праблему не то з плюшавымі мядзведзямі, не то са сланамі. Але гэта абсалютна розныя рэчы», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, Беларусь і Швецыя раней дамаўляліся абмяняцца новымі пасламі, аднак гэтыя дамоўленасці былі парушаны шведскім бокам, у выніку чаго і ўзнік цяперашні дыпламатычны канфлікт.

Што датычыцца інцыдэнту з палётам над Беларуссю шведскага самалёта, Аляксандр Лукашэнка сказаў: «Гэта іншая тэма. І гэта тэма патрабуе адказу па міжнародных стандартах ад Швецыі і Літвы, чым мы сёння і займаемся. І калі гэтых адказаў у адпаведнасці з міжнароднымі нормамі не будзе, мы знойдзем адэкватны адказ на плюшавыя справы».

«І няхай моляць бога, што нашы «памяркоўныя» беларусы пашкадавалі гэтых летуноў, — заўважыў беларускі лідар. — Іх зарэгістравалі адразу над граніцай. Пашкадавалі, бачыце, фанерны самалёт, а з гэтага атрымаўся скандал. Але гэта было парушэнне ўсіх дамоўленасцяў».

«І Літва — няхай не сядзяць як мышы пад венікам. Яны нам павінны адказаць, чаму прадставілі сваю тэрыторыю для парушэння дзяржаўнай граніцы», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Разам з тым Прэзідэнт адзначыў: «Калі мы пачалі расследаваць (пасол няхай не круціцца, што ён дэмакратыю ў нас абараняе), тыя, хто прыязджалі і рыхтавалі парушэнне дзяржаўнай граніцы, працавалі разам з пасольствам. У нас ёсць доказы. Следчыя іх прадставілі». «Таму мы яшчэ разбяромся, якую ролю адыграла былое шведскае пасольства ў гэтым інцыдэнце», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

Сучасны спорт увяз у карупцыі, лічыць Прэзідэнт. Аб гэтым ён выказаўся ў час размовы з жыхарамі Астравецкага раёна і будаўнікамі беларускай АЭС.

«Спорт не проста хворы, ён ушчэнт карумпіраваны. Гэтыя суддзі, якія прымаюць рашэнні, яны бяруць грошы і прысуджваюць перамогу таму, хто дае больш», — сказаў кіраўнік дзяржавы, каментуючы спартыўныя падзеі цяперашняй Алімпіяды і ўдзел беларускіх спартсменаў у ёй.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што правілы правядзення многіх відаў спорту змяняюцца літаральна на вачах, каб дагадзіць асобным спартыўным чыноўнікам: «Усё мяняецца на вачах. Напрыклад, умовы, правілы барацьбы ў спорце змяняюцца пад суддзю, чыноўніка, каб умяшацца і, на гэтым зарабіўшы грошы, каго-небудзь загубіць, каго-небудзь выкінуць».

Пры гэтым прадстаўнікі Міжнароднага алімпійскага камітэта робяць выгляд, што не заўважаюць тое, што адбываецца, лічыць Прэзідэнт. «МАКаўскія начальнікі — яны прыехалі туды нібыта толькі для таго, каб каралеве медаль уручыць. Іх жа нідзе не відаць і не чуваць. Чаму яны не ўмешваюцца? Ходзяць, пальцы растапырыўшы, грошы на гэтым зарабляюць, знішчаючы спартсменаў і зневажаючы дзяржавы, якія туды прыязджаюць. Вось у чым праблема», — падкрэсліў беларускі лідар.

У якасці прыкладу Аляксандр Лукашэнка прывёў сітуацыю з беларускім кідальнікам молата Іванам Ціханам. Паводле слоў Прэзідэнта, калі б аб нядопуску Ціхана папярэдзілі загадзя, Беларусь магла б зрабіць замену. Аднак яму адмовілі ва ўдзеле ў Алімпіядзе непасрэдна перад стартам, і Аляксандр Лукашэнка растлумачыў, чаму гэта адбылося. «Сусветную федэрацыю ці то ўзначальвае, ці то з'яўляецца там галоўным функцыянерам грамадзянін Венгрыі. А ў адсутнасць Ціхана хто заваяваў медаль? Венгерскі малатабоец. Значыць, яму расчысцілі дарогу, устараніўшы Ціхана. Маўляў, калісьці ў Ціхана 8 гадоў таму было нешта... Дык яго пераправерылі дзясяткі разоў. Ён абсалютна чысты беларускі хлопец. А яго ўзялі і выкінулі. А чаму выкінулі? Таму што адказнасці не адчуваюць», — пераканаўся кіраўнік дзяржавы.

«Вось што такое сёння спорт — гэта не палітыка, гэта бруд і карупцыя па ўсіх напрамках, дзе толькі магчыма. Я нават публічна не магу гаварыць пра ўсе факты, якія ведаю, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Але, думаю, у мяне будзе яшчэ магчымасць (не ў Англіі, дык у іншай краіне) усё, што я вам цяпер сказаў, сказаць гэтым функцыянерам».

У той жа час кіраўнік дзяржавы выказаў незадаволенасць і ўдзелам беларускай дэлегацыі ў Алімпійскіх гульнях у Лондане. «Мы разам з расіянамі пакуль правальваем Алімпіяду. Яны, вядома, шмат медалёў заваявалі, але не столькі, колькі павінны былі. І мы таксама», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт лічыць, што ў беларускім спорце таксама хапае праблем і недастаткова выкарыстоўваецца існуючы патэнцыял, ёсць прэтэнзіі і да трэнераў, і да спартсменаў, і да арганізатараў. «У нас ёсць і аб'екты, ёсць і магчымасць, і сродкі выдзелены, але веславанне, цяжкую атлетыку, спартыўную гімнастыку — мы ўжо страцілі гэтыя пазіцыі. А база ж добрая, трэнеры ёсць, чаму не працуем?» — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што ўсё, сказанае аб спорце, можна аднесці і да сельскай гаспадаркі і прамысловасці: «Тут спуску нікому не будзе. Няхай крыўдзяцца на мяне губернатары за апошнюю селектарную нараду ці не крыўдзяцца, а шкуру буду здымаць з усіх. Прыйшоў працаваць — працуй, каб людзі сказалі дзякуй».

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Святкуючы цяперашні юбілей, звяздоўцы памятаюць і аддаюць даніну павагі сваім папярэднікам. Галоўны рэдактар газеты Алесь КАРЛЮКЕВІЧ ускладае кветкі да помніка першаму рэдактару «падпольнай» «Звязды», Герою Савецкага Саюза Уладзіміру АМЕЛЬЯНЮКУ.

ДЗІЦЯ І ДАРОГА

У Бабруйску ў дарожна-транспартным здарэнні пацярпела 2-гадовая дзяўчынка. Аўтамабіль, якім кіраваў 24-гадовы мужчына, выехаў на сустрэчную паласу і ўдарыўся ў «ГАЗ». З траўмамі дзіця дастаўлена ў рэанімацыйнае аддзяленне бальніцы.

— Цяпер ідзе праверка здарэння, яго абставіны высвятляюцца, аднак ужо цяпер можна сказаць, што дзіця не знаходзілася ў аўтамабільным крэсле і не было прышпілена рэменем бяспекі, — паведаміла інспектар аддзялення па агітацыі і прапагандзе Магілёўскай ДАІ Таццяна Старасотнікава.

У час летніх вакацый у Магілёўскай вобласці пацярпелі ўжо 16 дзяцей. ДАІ рыхтуецца да жніўня, які звычайна вызначаецца павелічэннем ДТЗ з удзелам непаўналетніх, і аб'яўляе прафілактычную акцыю «Дзіця — галоўны пасажыр».

Ілона ІВАНОВА.

95 ЗВЯЗДА

Віншаванне любімай газеце

Ад усіх работнікаў лясной гаспадаркі і ад сябе асабіста сардэчна віншую калектыў газеты з 95-годдзем!

На старонках газеты «Звязда» мы знаходзім публікацыі, якія ўздымаюць самыя важныя пытанні лесагаспадарчага комплексу рэспублікі. Вы расказваеце пра нашых поспехі і праблемы, дапамагаеце данесці да грамадскасці тыя задачы, якія стаяць перад галіной у справе захавання, памнажэння і рацыянальнага выкарыстання лясных багацця Беларусі.

Журналістаў вашай газеты заўсёды вылучалі аб'ектыўнасць, пачуццё адказнасці за сваю справу, высокі прафесіяналізм і творчае майстэрства. Менавіта гэта прынесла «Звяздзе» заслужаны аўтарытэт і павагу шматтысячнай чытацкай аўдыторыі.

Зычу вам прафесійнага прызнання, творчых удач, журналісцкага азарту і моцнага здароўя, шчасця вам і вашым блізкім!

З павагай, міністр лясной гаспадаркі М.М. АМЕЛЬЯНОВІЧ.

Цэнтральны камітэт Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі віншуе калектыў рэдакцыі газеты «Звязда» з 95-годдзем вельмі паважанага і любімага выдання, якое адзначаецца 9 жніўня, у дзень выхаду яго першага нумара.

«Звязда» — гэта не толькі выданне, гэта люстра няпростай гісторыі беларускай дзяржавы. Па яе публікацыях, ацэнках разнастайных з'яў нашай рэчаіснасці, нават па яе мове можна прасачыць пакручасты, неадназначны і, тым не менш, жыццесцвярджальны шлях Беларусі і беларусаў. Лёс газеты быў такім жа няпростым. Калектыў рэдакцыі годна прайшоў самыя розныя выпрабаванні, таму і сёння ён верны традыцыям, няўрымслівы ў пошуку новых формаў, сцвярджэнні сябе ў розных жанрах. Выданне было і застаецца ўзорам стаўлення да мовы, аб'ектыўнай падачы фактаў, густоўнай аналітыкі і публіцыстыкі.

За доўгі час станаўлення і развіцця «Звязды» журналісты розных пакаленняў засведчылі на старонках газеты разуменне праблем сістэмы адукацыі, найперш яе работнікаў і навучэнцаў. І сёння выданне застаецца вельмі блізкім для нашай галіны, дзякуючы вельмі адказнаму, неардынарнаму і чуламу падыходу да асвятлення пытанняў школ і садкоў, устаноў прафесійнай адукацыі і навукі.

Стасункі газеты і галіновага прафсаюза маюць свае добрыя традыцыі. У гісторыі як выдання, так і галіновага прафсаюза ёсць такія славутыя асобы, як Якуб Колас і Янка Маўр.

Мы паразумеліся ў бачанні самых розных бакоў дзейнасці асветнікаў Беларусі і навучэнскай моладзі. Прыемна, што журналісты «Звязды» звяртаюць уласную пазіцыю з пунктам погляду прафсаюза работнікаў адукацыі, які, у сваю чаргу, адказна ставіцца да адпаведных публікацый як плёну не толькі шчырага супрацоўніцтва з сапраўднымі прафесіяналамі, але і ўласнай прысутнасці ў сучаснай інфармацыйнай прасторы.

Дазвольце напярэдадні слаўнай даты пажадаць вам удзячных чытачоў, разумення заснавальнікаў, творчага натхнення, здароўя і ўдачы, а таксама ажыццяўлення вашых задум і планаў. Няхай «Звязда» як выданне і як выдавецкі дом будзе заўсёды ўтульнай і прывабнай для журналісцкіх талентаў сённяшняй і будучай квітнеючай Беларусі.

■ Здарэнні

У ЛЕСЕ ПРАПАЎ ЧАЛАВЕК

Увечары ў Мінскі раённы аддзел па надзвычайных сітуацыях паступіла паведамленне адносна прапажы чалавека ў лесапаласе паблізу вёскі Малая Валоўшчына.

— Было высветлена, што ўдзень напярэдадні мінчанін-пенсіянер 1952 года нараджэння, які быў на сваёй дачы ў вёсцы Малая Валоўшчына, выправіўся ў лес у кірунку вёскі Захарычы. І не вярнуўся. Увечары наступнага дня занепакоеная жонка звярнулася ў Мінскае РУУС, — паведамілі ў Мінскім абласным упраўленні МНС. Пошукі прапаўшага праводзяць супрацоўнікі міліцыі, выратавальнікі. Па апошніх звестках, знайсці чалавека пакуль не атрымалася. Пошукі працягваюцца.

СНАРАДЫ НА ПАЛІГОНЕ

Пры правядзенні земляных работ на палігоне ў пасёлку Калодзішчы Мінскага раёна ўвечары быў знойдзены прадмет, падобны на снарад. Месца знаходкі ахоўвалася супрацоўнікамі міліцыі. Група размініравання ўстанавіла: тут «хаваліся» два 75-міліметровыя снарады з узрывальнікамі і 76-міліметровы бранябойны снарад часоў Вялікай Айчыннай вайны. Боепрыпасы былі знішчаны.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ДАЎ ПАРУЛІЦЬ?

У рэанімацыі зараз знаходзіцца 17-гадовы юнак, які кіраваў машынай «Kia» на аўтадарозе, што вядзе ад пункту пропуска Новая Гута да Гомеля. Сям'я (бацька і двое сыноў з горада Чэхава Маскоўскай вобласці) вярталіся з адпачынку дадому. Аварыя адбылася каля вёскі Калініна. У прэс-службе ДАІ УУС Гомельскага аблвыканкама расказалі, што хлопец не справіўся з кіраваннем і выехаў на паласу сустрэчнага руху, пасля чаго іншамарка сутыкнулася з МАЗам. У выніку 47-гадовы бацька, які сядзеў на пярэднім сядзенні, загінуў на месцы здарэння. Старэйшы 21-гадовы сын памёр ад траўмаў у бальніцы. За жыццё малодшага змагаюцца медыкі.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

■ Абітурыент-2012

БРАТЫ-2

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Журналісты многіх краін не перастаюць сваіх беларускіх калег пытаць, у чым сіла братоў-Багдановічаў?

Андрэй: У пастаянных трэніроўках, самаадданасці, пастаянным пачуцці лідарства. Гэта дапамагае нам быць заўсёды ў форме, выйграваць чэмпіянаты свету і іншыя топ-турніры.

Аляксандр: А яшчэ ў нашым характары, у тым, што бацькі заклалі, ад прыроды.

— Мяркуючы па тым, як вы пасля фінішу цесна браталіся з нямецкім экіпажам, сіл у вас яшчэ хопіць, каб канкурыраваць з дзейнымі алімпійскімі чэмпіёнамі?

Андрэй: Мы на гэта таксама вельмі спадзяёмся. Што тычыцца цеснага кантакту з германскім дуэтам, то тут усё тлумачыцца проста. Мы ж жывыя людзі, і канкурэнты толькі на старце. А пасля фінішу мы можам павіншаваць адзін аднаго, падбадзёрыць.

Аляксандр: Гэта, можна сказаць, няпісанае правіла для спартсменаў. Тым больш, цяперашніх пераможцаў Петэра Крэтшмера і Курта Кучэлу мы добра ведаем па апошніх стартах на чэмпіянаце Еўропе ў Заграбе. Гэта ж жыццё: сёння яны выйгралі, заўтра на вышэйшай ступені п'едэстала мы будзем.

— Значыць, беларускім аматарам веславання на каноэ можна разлічваць, што браты Багдановічы застаюцца на вадзе і будуць рыхтавацца да наступных гульняў-2016 у Рыа-дэ-Жанейра?

Андрэй: Мы яшчэ так далёка не заглядвалі наперад, каб гаварыць пра нейкія грандыёзныя планы на чатыры гады наперад.

Аляксандр: Скажам па-іншаму: пакуль «завязваць» з веславаннем на каноэ мы не збіраемся. Збіраемся выступаць столькі часу, пакуль зможам годна прадстаўляць Рэспубліку Беларусь на прэстыжных міжнародных стартах.

— Каму будзе прызначана прэмія Прэзідэнцкага спартыўнага клуба ў 75 мільёнаў рублёў?

Андрэй: Бабруйскаму вучылішчу алімпійскага рэзерву.

Аляксандр: Дзе мы выраслі і адкуль атрымалі пуцёўку ў вялікае спартыўнае плаванне.

— Кіраўніцтва горада і раёна давала наказ ці называла стымул за паспяховае выступленне ў Лондане?

Андрэй: Пра розныя стымулы і прэміяльныя мы не думалі. Бо ў такім выпадку наогул нічога не даб'ешся.

Аляксандр: Мы выступаем не столькі за сябе, колькі за нашу краіну, за яе інтарэсы. Як патрыёты, мы за яе перажываем і хочам годна прадстаўляць яе на міжнароднай арэне.

Уладзімір ЗДАНОВІЧ.

ПЛАТНАЯ ФОРМА НАВУЧАННЯ ДАСТУПНАЯ ЎСІМ?

У Беларускім дзяржаўным універсітэце падвялі вынікі залічэння студэнтаў на платную форму навучання. Нельга назваць нечаканасцю той факт, што самыя высокія балы аказаліся ў абітурыентаў, залічаных на факультэт міжнародных адносін, паколькі на дзённую бюджэтную форму навучання прахадны бал на спецыяльнасці «міжнародныя адносіны» — 369. Усе залічаныя на платную форму навучання на факультэт міжнародных адносін набралі ў суме больш як 200 балаў, а 40% з іх набралі больш як 300 балаў. Прахадны бал на спецыяльнасць «лінгвакраіназнаўства» склаў 284, «міжнароднае права» — 268, «міжнародныя адносіны» — 243, «менеджмент у сферы міжнароднага турызму» — 242, «сусветная эканоміка» — 201, «мытная справа» — 205.

На факультэце філасофіі і сацыяльных навук больш як 300 балаў набралі 10% залічаных на першы курс студэнтаў-«платнікаў», а ў Інстытуце бізнэсу і менеджменту тэхналогій уладальнікамі сумы ў 300 балаў і больш з'яўляюцца 22% залічаных.

На эканамічным факультэце сярэдні прахадны бал склаў 216. Больш як 200 балаў набралі 62% абітурыентаў. На юрыдычным факультэце сярэдні прахадны бал — 242. Больш як 200 балаў набралі 95% абітурыентаў.

Увогуле, калі параўноўваць прахадныя балы на дзённую бюджэтную і платную форму навучання, то няцяжка прыйсці да высновы, што на асобных спецыяльнасцях яны могуць адрозніваца на сотню адзінак. А на шэрагу факультэтаў БДУ на платнай форме навучання ўвогуле адсутнічаюць прахадныя балы — гэта значыць, што там былі залічаны ўсе, хто выказаў жаданне вучыцца і плаціць за сваё навучанне немалыя грошы. Напрыклад, Інстытут журналістыкі вымушаны быў узяць абсалютна усіх ахвотных працаваць у друкаваных СМІ, быць тэлежурналістамі, займацца вэб-журналістыкай або літаратурнай творчасцю.

Факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ сёння вядомы на ўвесь свет дзякуючы пастаянным перамогам яго выхаванцаў на міжнародных інтэлектуальных спаборніцтвах па матэматыцы і праграмаванні. Невыпадкова менавіта сюды паступаюць пераможцы рэспубліканскіх і школьных міжнародных алімпіяд. Таму на дзённай бюджэтнай форме навучання на факультэце прыкладной матэматыкі і інфарматыкі 93% залічаных на першы курс набралі больш як 300 балаў, а сярэдні бал залічаных склаў 331. Затое на платную форму навучання на ФПМІ конкурсу ўвогуле не было, а сярэдні бал залічаных склаў 205. Больш як 200 балаў набралі 58% ахвотных навучацца тут за ўласныя сродкі. Атрымліваецца, што амаль кожны другі абітурыент, які замахнуўся на вельмі складаную ўніверсітэцкую праграму, набралі ў суме за тры тэсты плюс атэстат значна меншую суму.

А ў Беларускім дзяржаўным педагагічным факультэце конкурсу на платнай форме навучання і ўвогуле не было, за выключэннем адной толькі спецыяльнасці «спартыўна-турыстычная дзейнасць» (менеджмент у турызме). Да таго ж і балы за тэсты ў будучых педагогаў зусім невысокія.

Надзея НІКАЛАЕВА

■

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Миноблавтотранс» (продавец) проводит повторный открытый аукцион

по продаже объектов недвижимого имущества, расположенных по адресу: **Минская область, Клецкий район, г. Клецк, ул. Привокзальная, д. 3,** в составе: производственное здание (инв. № 641/С-9175), об.пл. 2115,2 кв.м.; административно-бытовое здание (инв. № 641/С-9176), об.пл. 2026,8 кв.м.; здание мастерской (инв. № 641/С-9177), об.пл. 1071,9 кв.м.; здание мастерской (инв. № 641/С-9178), об.пл. 1210,9 кв.м.; ж/б ограждение (инв. № 641/С-10863); здание котельной (инв. № 641/С-11123), об.пл. 126,3 кв.м.; ограждение из металлической сетки (инв. № 641/С-11124); асфальтобетонное покрытие (инв. № 641/С-11126), об.пл. 2523 кв.м.

Начальная цена с НДС (снижена на 50 %) – 1 850 853 573 бел. руб.

Площадь земельного участка – 5,2783 га (предоставлен продавцу на праве постоянного пользования).

Задаток 10% от начальной цены перечисляется: резидентами РБ на р/с № 3012108260016; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в евро (EUR) – 3012108260032; в долларах США (USD) – 3012108260029; в российских рублях (RUB) – 3012108260045; в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015 Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 (пяти) рабочих дней после проведения аукциона.

Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **12.09.2012** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **07.09.2012** до 17.00 по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224-61-34; 500-47-12.

Открытое акционерное общество «Радиотехника» проводит ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ 23 августа 2012 года в 15.00 по адресу: Гродненская обл., г. Ошмяны, ул. Я. Колоса, 1.

Повестка дня собрания:

1. Об утверждении изменений и дополнений в Устав Общества и принятие его в новой редакции.

2. Об изменении состава ревизионной комиссии.

Собрание проводится в очной форме.

Регистрация участников собрания с 14 час 30 мин. Акционерам иметь при себе паспорт, представителям акционеров — паспорт и доверенность. Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, — 23.08.2012; реестра — 10.08.2012.

Ознакомление акционеров с материалами по вопросам повестки дня собрания: в рабочие дни (понедельник—пятница), начиная с 12.08.2012 у председателя НС.

Основание созыва внеочередного собрания — решение наблюдательного совета от 07.08.2012.

УНП 500227068

ПАНЯДЗЕЛАК, 13 ЖНІЎНЯ

БЕЛАРУСЬ 1

6.00, 7.10, 7.35, 8.15, 8.35 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.45** Навіны.
7.05, 8.05, 18.45, 23.35 Зона Х.
7.30, 8.30 Дзелавое жыццё.
9.10 У цэнтры ўвагі.
10.05 Час Саюза.
11.00 «Зорнае жыццё». «Устань і ідзі».
12.10 Серыял «Маргоша».
14.05 М/ф «Баранкін, будзь чалавекам!».
14.25 Дак. фільм «Браслаўшчына. Край Божай апекі».
15.15, 19.20 Навіны рэгіёна.
15.25 «Мая праўда». «Аляксандр Барыкін. Разарваное сэрца».
16.15 Дак. серыял «Мудрагелістыя светы». 1-я серыя.
17.15 Серыял «Маруся. Вяртанне».
18.15 Арэна.
19.40 Калыханка.
19.55 Серыял «Сваты-5».
21.00 Панарама.
21.45 Серыял «За ўсё табе дзякую-2».
22.45 Серыял «Доктар Хаус-6». Заключная серыя.
0.05 Дзень спорту.
0.15 Меладрама «Псіхааналітык».

АНТ

6.00, 8.30, 9.00 (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 Контуры.
10.05 «Жыць здорава!».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00 Навіны спорту.
11.10 Серыял «Капітан Гардзееў».
12.05 Серыял «Сэрца Марыі».
13.10 «Хачу ведаць».
13.40 «Кантрольная закупка».
14.10 «Модны прыгавор».
15.10 Серыял «Заручальны пярсцёнак».
16.15 Меладрама «Манале-тэ».
18.20 «Адваротны адлік». «Спецназ «Анадыр». Тайны Карыбскага крызісу».
19.05 «Чакай мяне».
20.00 Час.
21.05 Серыял «Дом узорнага ўтрымання».
22.15 «Тэма дня».
22.25 Серыял «Закрытая школа».
23.30 Тэорыя неверагоднасці. «Выхад у астрал. Непрыдуманыя гісторыі».
0.30 «На ноч гледзячы».
1.10 Начныя навіны.

БЕЛАРУСЬ 2

7.00 Раніца.
9.00, 21.20 Тэлебарометр.
9.05, 17.50 Дэтэктыў «Замах». 1-я серыя.
10.05 Лондан-2012. Урачыстая цырымонія закрыцця Алімпійскіх гульняў.
13.10 Кінааповесць «Корцік». 1-я серыя.
14.40, 22.30 Серыял «Мужчына ўва мне».
15.45, 21.30 Серыял «Гуманоіды ў Каралёве».
16.50 Беларуская часінка.
18.55 Мюзікл «Дзяўчаты мары».
21.25 КЕНО.
23.20 Камедыя «Я так ненавіджу сваю працу».

СТБ

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «Міншчына».
6.20, 7.45 «Раніца. Студыя добрага настрою».
7.40, 20.10, 22.55 «СТБ-спорт».
8.30 «Тыдзень».
9.35 «Вялікае сняданне».
10.10 «Зялёны агурок. Карысная перадача».
10.40 «Сямейныя драмы».
11.40, 17.30 «Званая вячэра».
12.35 «Ніна». Серыял. Заключная серыя.
13.50 «Цэнтральны рэгіён».
14.20 «Зорны рынг». Лепшае.
15.15 Канцэрт Міхаіла Задорнава.
16.50 «Рэпарцёрскія гісторыі».
17.10 «Наша справа».
18.30 «Які памнажае смутак». Серыял.
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.15 «Добры вечар, малы».
20.40 Маст. фільм «Амерыканская дачка».
23.00 «Тайны свету».
23.50 «Пякельная кухня».

МІР

5.00, 6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 15.00, 17.00, 18.00, 21.00, 22.00, 23.00, 0.00, 1.00 Навіны Садружнасці. (Бягучы радок.)
5.05, 6.05 Серыял «Ваўчыха».
7.05 «Цік-так».
7.25 «Ёга Life».
8.05 «Энцыклапедыя смаку».
8.35, 9.05, 10.05 Серыял «Трымай мяне мацней».
11.05 «Кыргызстан у асобах».
11.25 «Зроблена ў СССР».
12.20, 1.50 Маст. фільм «Юркавы свiтанкi».
15.20 Серыял «Заручальны пярсцёнак».
17.05, 23.05 Ток-шоу «Слова за слова».
18.20 Серыял «Нянавісць».
20.20, 4.20 «Музычны ілюмінатар».
22.05 «Неверагодная праўда пра зорак».
0.05, 1.05 Серыял «Камісар Наваро».

8 КАНАЛ

7.00, 9.55, 12.00, 18.55, 21.00, 23.35 «Надвор'е».
7.05 «На рыбалку».
7.20, 14.10 Серыял «Выратуй мяне».
9.00, 17.50 Серыял «Дзённік доктара».
10.00 «Кулінарныя парады».
10.30 Маст. фільм «Падарожжа».
11.55 Трылер «Вострaў пракляцтых».
15.40, 23.15 «Кінаблакнот».
16.00 Мультпарад.
16.30 «Мой любімы гадаванец».
17.00 Серыял «Аднойчы ў казцы».
19.00 Серыял «Рэванш».
20.45 «Вечарніца».
21.05 Драма «Настрадамус».

ВТБ

6.00, 0.40 «PLAY».
8.00, 18.00 Скетч-шоу «Мастарсмех».
8.30, 18.30 «Гісторыі ў дэталях».
9.00, 20.00 Серыял «Татавы дочкі».
10.00 «Добрыя жарты».
12.00 «Гарадское падарожжа».
13.00, 22.10 «Не можа быць».
14.00 «Двое».
15.00 «Усё пад кантролем».
16.00 «Скажы, што не так?!»
17.00, 19.00 Серыял «Цацкі».
17.30, 19.30 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
21.00 «Мужчынскія гісторыі».
23.10 «Па-за законам».
23.40 «Дарожныя войны».
0.10 Дэтэктыў «Шлюбнае чытво».

РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «Раніца Расіі».
10.00 «Пакой смеху».
10.55 Надвор'е на тыдзень.
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.30 «Ранішняя@пошта».
12.00 «Прамы эфір».
12.50 Серыял «Інстытут высакародных дзяўчат».
13.50, 16.50, 19.50, 23.05 Навіны — Беларусь.
14.30 Ток-шоу «З новым домам!».
15.10 Ток-шоу «Пра самае галоўнае».
15.55, 20.30 Серыял «Самара».
17.30 Мясцовы час. Весткі — Масква.
17.45 Весткі. Дзяжурная часць.
17.55 «Кахаю, не магу!».
18.55 Серыял «Ефрасіння. Працяг».
21.25 Серыял «Тайны следства».
23.15 «Гарадок».
0.10 Серыял «Дэтэктыўнае агенцтва «Іван ды Мар'я».

НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.05 «НТБ раніцай».
8.15 Серыял «Вяртанне Мухтара».
10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.05 Сёння.
10.20 «Чыстасардэчнае прызнанне».
11.05 «Да суда».
12.00 Суд прысяжных.
13.20 «Судовы дэтэктыў».
14.25 «Сярод белага дня».
15.15 «Справа густу».
15.40, 18.35 Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
16.20 «Пракурорская праверка».
17.20 Ток-шоу «Гаворым і паказваем».
18.10 Галоўная дарога.
19.35 Серыял «Залаты запас».
21.15 Серыял «Дазнаўца».
23.30 Серыял «Глухар. Працяг».

ІНТЭР+

7.00 Феерыя падарожжаў.
7.20, 11.55 Краіна смяецца.
